436

ФПП 99

# ПСИХОЛОГИЯ И ДЕТИ:

## *рефлексия по поводу защиты прав ребенка*

Министерство образования Республики Беларусь

Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка

Факультет прикладной психологии

# ПСИХОЛОГИЯ И ДЕТИ:
# РЕФЛЕКСИЯ ПО ПОВОДУ ЗАЩИТЫ ПРАВ РЕБЕНКА

## МАТЕРИАЛЫ МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ

24-25 марта 1999 года

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск 1999

УДК 159
ББК 88.5
П 863

Редакционный совет:
Я.Л.Коломинский (гл.ред.)
Гаэтано Барлетта,
А.А.Амельков,
С.И.Коптева,
А.П.Лобанов,
В.И.Слепкова,
Л.В.Финькевич,
И.А.Фурманов

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В сборник вошли материалы, присланные в оргкомитет международной научно-практической конференции. Авторы затрагивают широкий круг проблем защиты детской субъективности в процессе социализации личности ребенка.

В подготовке материалов сборника к печати приняли участие члены оргкомитета, сотрудники факультета прикладной психологии Белорусского государственного педагогического университета им. М.Танка.

Содержание издания отражает весь спектр взглядов на указанную проблему не только в психологической науке, но и в смежных дисциплинах. В материалах сборника сохранены стиль и терминология авторов. Сборник предназначен для психологов, педагогов, социологов, работников медицинских и юридических учреждений, аспирантов и студентов психологических факультетов.

ISBN 985-435-135-1

© Коллектив авторов, 1999.

# МАГЧЫМАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ НЕТРАДЫЦЫЙНЫХ МЕТАДАЎ ДАСЛЕДАВАННЯ МІЖАСОБАСНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ АСОБЫ Ў ВУЧЭБНЫХ ГРУПАХ

Амялькоў Ан.А., Амялькоў, Ал.А.

У сучасных айчынных даследаваннях міжасобаснага ўзаемадзеяння часцей выкарыстоўваюцца розныя метады. Часцей выкарыстоўваюцца розныя варыянты сацыяметрыі (параметрычнай і непараметрычнай), аўтасацыяметрыі (варыянты сацыяграмы і сацыяматрыцы), рэферэн-таметрыі, методыка дыягностыкі міжасобасных адносін Т.Ліры, методыка Q - сартыроўка, назіранні за зносінамі, гутаркі, анкетаванне і др. Пры вывучэнні міжасобаснага ўзаемадзеяння многія дас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ледчыкі, асабліва тыя, якія пачынаюць даследаванні, пры выкарыстанні адзначаных метадаў вывучаюць толькі асобныя бакі гэтага складанага феномена і вельмі часта парушаюць асноўныя прынцыпы яго даследавання.

У аснове прынцыпаў даследавання ляжыць метадалагічны падыход, які распрацаваны ў даследаваннях Я.Л.Каламінскага і яго вучняў. Сутнасць падыходу заключаецца ў тым, што міжасобаснае ўзаемадзеянне складаецца з знешняга боку - паводзін чалавека, якія можна назіраць; і ўнутранага - міжасобасных адносін, якія прадстаўляюць сабой эмацыянальна афарбаваныя думкі (перажыванні) адносна людзей. Апошнія можна вывучаць толькі пры дапамозе спецыяльных метадаў. У адпаведнасці з адзначаным падыходам метады можна падзяліць на дзьве групы: 1) метады для вывучэння знешняга боку ўзаемадзеяння - зносін 2) метады, якія выкарыстоўваюцца для вывучэння міжасобасных адносін. Да першай групы, на наш погляд, можна аднесці наступныя метады: розныя варыянты назірання, анкетаванне, гутарку, методыку дыягностыкі міжасобасных адносін Т.Ліры, методыку Q - сартыроўка і др. Другую групу метадаў, пры дапамозе якіх вывучаюць больш глы-бокія міжасобасныя сувязі - адносіны, складаюць розныя варыянты сацыяметрыі і аўтасацыяметрыі, рэферэнтаметрыя, методыка Рэне Жыля і праектыўныя метады. Да гэтай групы мы адносім нетрадыцыйныя метады, якія распрацаваны намі. Гэта методыка "Каляровы тэст вывучэння міжасобасных адносін" [1] у малай групе , "Экспрэс-методыка вывучэння міжасобаснага ўзаемадзеяння" у малай вучэбнай групе [2] і праксемічныя метады.

Так методыка "Каляровы тэст вывучэння міжасобасных адносін" у малай групе дазваляе выявіць структурныя паказчыкі адносін: статусную дыферынцыяцыю ў групе (класе), паказчыкі дабрабыту, аптымальнасці адносін, каэфіцыенты зорнасці і ізаляванасці. Пры гэтым адзначаныя паказчыкі з`яўляюцца валіднымі і надзейнымі і менш залежнымі ад уплыву настаўнікаў ці даследчыкаў. Акрамя структурных паказчыкаў гэты тэст дае магчымасць выявіць шэраг зместавых характарыстык, якія нельга атрымаць з дапамогай такіх традыцыйных метадаў як сацыяметрыя, аутасацыяметрыя, рэферэнтаметрыя і др. Так, каляровы тэст дазваляе вывучыць перажыванні, якія ахопліваюць асобу ў міжасобасных адносінах, а таксама выявіць наяўнасць трывожнасці ў адносінах, лаказчыкі працаздольнасці кожнай асобы ў дадзенай групе і многа другіх важкіх характарыстак.

Выкарыстанне "Экспрэс-методыкі вывучэння міжасобаснага ўзаема-дзеяння" дазваляе адначасова вызначыць структурныя паказчыкі ў роз-ных сістэмах узаемадзеяння і даць ўяўленні аб аб многіх яго зместавых характарыстыках. Экспрэс-методыка выяўляе наяўнасць "лідэраў", "актыўных", "пасіўных", "ізаляваных" у зносінах, вызначае "зорак", "маючых перавагу ў адносінах", "прынятых", "непрынятых" і "ізаляваных" у міжасобасных адносінах, дае ўяўленні аб аб`ектыўнай структуры групы ў сістэме сумеснай дзейнасці, выяўляе рэферэнтамнтрычную структуру ("рэферэнтаметрычных зорак", "рэферэнтаметрычных прынятых" і г.д.), характарызуе статусную структуру ў сістэме эмацыяльнай прывабнасці, вызначае суадносіны ў ролявай структуры вучэбнай групы (класа).

Колькасны і якасны аналіз дыферынцыяцыі членаў групы дазваляе выявіць паказчыкі дабрабыту, аптымальнасці, зорнасці (лідэрства), ізаляванасці адразу ў сістэме зносін, сумеснай дзейнасці, міжасобасных адносін заснаваных на эмацыянальнай прывабнасці, значнасці (рэферэнтнасці) і сацыяметрычных крытэрыях. Аналіз дадзеных дазваляе вызначыць колькасныя суадносіны наступных сацыяльных роляў у вучэбнай групе (класе): генератараў ідэй, крытыкаў, выканаўцаў, арганізатараў, эрудытаў, камунікатараў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дадзеныя, якія атрымліваюцца з дапамогай "Экспрэс-методыкі", дазваляюць дакладна вызначыць паказчыкі згуртаванасці групы ў міжасобасным узаемадзеянні, характарызаваць самаацэнку асобы адразу ў сістэмах зносін, сумеснай дзейнасці і міжасобасных адносінах. Адзначаная методыка прадастаўляе магчымасць вызначыць узровень сацыяльна-псіхалагічнай назіральнасці кожнага ўдзельніка міжасобаснага ўзаемадзеяння. Экспрэс-методыка спрыяе атрымаць дадзеныя, якія дазваляюць пабудаваць трохфактарную мадэль міжасобаснага ўзаемадзеяння, для асэнсавання далейшага яго развіцця і карэкцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ